**МАСЛЕНІЦА** (Сырны тыдзень, Масленка) — зімова-вясенні тыдзень перад пачаткам праваслаўнага Вялікага посту. Абрадавымі стравамі тыдня лічацца бліны, масла, тварог і сыр. Нашы продкі штодзень частаваліся блінамі без мяса, таму паводле хрысціянскага звычаю тыдзень называўся мясапусным — пустым ад мяса. На гэтым тыдні зяці маглі завітаць да сваіх цешчаў на бліны.



***Без смаргонскіх абаранак***
***Няма ў масленіцу свята.***
***Даравальны свеціць ранак,***
***Пахне водарам гарбата.***
***Будзем зіму замыкаці,***
***Будзем мы вясну загукаці,***
***Будзем крыўды даруваці,***
***Пана Бога ўслаўляці.***

У нядзелю, якая называецца даравальнай, у цэрквах адбываецца абрад ачышчэння, калі пры канцы набажэнства святар просіць даравання ў прыхаджанаў, якія тройчы адказваюць: «Бог даруе!»
У даравальную нядзелю ў кожным праваслаўным доме ўсе просяць даруваць адзін аднаму. У колішнія часы гаспадар сядаў на покуце пад абразамі, чытаў малітву і прасіў даравання ў сваіх продкаў — дзядоў і прадзедаў. Потым па чарзе, ад старэйшага, на сярэдзіну пакоя выходзілі сыны і дочкі і прасілі ў бацькі: «Прабач, бацька родны, калі чым саграшыў перад табою, справай або языком». Затым прасіла даравання маці. Пасля гадаванцы сядалі на лавы — сыны справа, дочкі злева. Бацька выходзіў на сярэдзіну пакоя, тройчы кланяўся ўсім і таксама прасіў даруваць за нядобрыя словы або дрэнныя ўчынкі.

Ала КЛЕМЯНОК.

Фота Алесі КЛІМАНТОВІЧ.